## Спецсемінар “Міфа-паэтычная творчасць”

### Тлумачальная запіска

Сёння ў навучальных установах Беларусі няма праграм па ўсходнеславянскай міфалогіі, якія б адпавядалі задачам сучаснай навукі. Прапануемы спецсемінар арыентаваны на цэласную наватарскую метадалогію, што мае на мэце кардынальныя зрухі ва ўсёй сістэме філалагічнага навучання. У наш час міфалогія разглядаецца не проста як збор паданняў і легендаў, але як анталогія, як аснова чалавечай культуры, як паэтычная філасофія, як непасрэдны выток фальклору і прыгожага пісьменства, як найважнейшая база шмат якіх псіхічных працэсаў і з’яў не толькі старажытнасці, але і сучаснага жыцця. З пункту гледжання міфалогіі можна вывучаць мову, семіётыку, тэорыю інфармацыі, псіхалогію. Праз міфалагічныя ўстаноўкі лепш бачацца сучасны сацыяльны, ідэалагічны, эстэтычны стан грамадства. Без міфалогіі ўжо немагчыма вывучаць тэорыю літаратуры (паходжанне тропаў), сучасныя напрамкі ў літаратуры (напрыклад, постмадэрнізм). З гэтага пункту гледжання вывучэння міфалогіі аказваецца надзвычай важным і перспектыўным у плане азнаямлення студэнтаў з асновамі філалагічнай навукі ў цэлым у яе сувязі з псіхалогіяй і культуралогіяй. Менавіта з такіх пазіцый складзена праграма.

**Мэта спецсемінара**: Пазнаёміць студэнтаў з міфалогіяй як формай свядомасці, якая з’яўляецца асновай культуры ў цэлым, яе формаў: мовы, фальклору, літаратуры, рэлігіі, мастацтва. Канцэптуальна і шматаспектна даследаваць праяўленне міфалагічнага мыслення як структураўтваральнай і тропаўтваральнай парадыгмы фальклорных і літаратурных твораў. Паказаць стасункі міфа і літаратуры ў эвалюцыйным і тыпалагічным аспектах. Прывіваць студэнтам навыкі навуковай работы.

**Задачы спецсемінара**:

- паказаць значэнне міфалогіі як сукупнай паэтычнай спадчыны продкаў, увасобленай ў мове і ў сюжэтах літаратурных твораў;
- раскрыць асаблівасці міфалагічнага мыслення, з якога прадуцыруюцца універсальныя культурныя сімвалы – архетыпы;
- прасачыць развіццё міфалогіі побач з развіццём мовы; у сувязі з гэтым з новых пазіцый падыходзіць да этымалогіі слоў нацыянальнай мовы, што дае магчымасць больш глыбока і тонка разумець тропіку літаратурных твораў;
- ускрыць сэнс міфалогіі як асновы грамадскай этыкі і народнай маралі, адлюстраваных таксама і ў канкрэтных творах мастацкай літаратуры, што ўзмацняе яе выхаваўчае значэнне;
- даць магчымасць студэнтам зразумець адрозненне навукі, якая гаворыць аб прычынах тых ці іншых з’яў, і міфалогіі (рэлігіі), якая паказвае мэту чалавечага жыцця і дае адчуць здольнасць чалавека да звышпачуццёвага ўспрыняцця. У сваю чаргу гэта дазволіць больш глыбока зразумець фальклор і літаратуру як анталагічны від мастацтва;

- у сувязі з вывучэннем міфалогіі і этнічных сімвалаў, праяўленых у нацыянальнай літаратуры, вывесці студэнтаў на некаторыя праблемы псіхалогіі творчасці; паказаць міфалогію і літаратуру як псіхалогію, спраектаваную на знешні свет, што ў значнай ступені дапаможа студэнтам лепш зразумець саміх сябе;
- звязаць міфалагічнасць і тыповасць у мастацкай творчасці;
- паказаць міфалагічныя мадэлі чалавечых паводзін, выяўленыя ў фальклорных і літаратурных казках; праз казачную творчасць пазнаёміць студэнтаў з прынцыпамі дзеяння чалавечай фантазіі;
- павысіць агульна-філасофскі і літаратурна-тэарэтычны ўзровень студэнтаў праз вывучэнне міфалагічных вытокаў вобразнага мыслення, што адкрывае перспектывы больш тонкага разумення паэтыкі мастацкіх твораў.
- пазнаёміць студэнтаў з сістэмай усходнеславянскай міфалогіі.
- прасачыць пераход міфа ў літаратуру як непасрэдна, так і апасродкавана: праз філасофскія канцэпцыі, псіхааналіз праз выяўленчае мастацтва, праз абрады і рытуалы.

**Праблематыка спецсемінара:**

1. Станаўленне і развіццё чалавечага мыслення. Асаблівасці міфа-паэтычнага мыслення.
2. Міф і сімвал. Універсальная чалавечая сімволіка. Сімвалатворчасць у літаратуры. Праблема тыповасці ў літаратуры. Сюжэтныя мадэлі.
3. Генезіс літаратурных тропаў у сувязі з міфалогіяй.
4. Рэканструяванне пантэону славянскіх багоў праз фальклорныя і летапісныя тэксты.
5. Міфалогія – гісторыя – літаратура. Міф як гісторыя, занатаваная ў нацыянальнай памяці, выкарыстанне легендаў, паданняў у літаратуры. Лінейнасць гісторыі і цыклічнасць міфа. Цыклізм у мастацкіх творах.
6. Паняцце сакральнага ў літаратуры.
7. Вобразы нацыянальнай, антычнай, біблейская міфалогіі ў творах класікаў беларускай літаратуры і сучасных пісьменнікаў.
8. Эстэтычныя сродкі ўздзеяння міфалогіі на чалавека.
9. Гісторыя міфалогіі як навукі.
10. Рэканструкцыя міфалагічнай спадчыны.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА КУРСА

## УСТУП

Разуменне міфалогіі як формы светапогляду, светаадчування старажытных славян. Міф як анталогія. Міф і псіхалогія.

Міфалогія і мова як першыя сістэмы чалавечай свядомасці. Міфалогія і рэлігія. Міфалогія і фальклор. Міфалогія і літаратура. Міф у сістэме культуры. Парадыгматычная функцыя міфа.Міфалогія і навука. Праяўленні міфалагічнага светапогляду ў наш час. Метамоўнае разуменне паняцця “міфалогія”. Гісторыя міфалогіі як навукі.Вытокі звестак пра міфалогію: пісьмовыя помнікі, звесткі замежных аўтараў, фальклор, этнаграфія, дадзеныя археалогіі, тапаніміка і інш.

Светапоглядная парадыгма XX стагоддзя: набліжэнне адно да аднаго рэлігіі, мастацтва, навукі. Сучасная міфалогія: палітычныя, масмедыйныя, сацыяльныя міфы.

## РАЗДЗЕЛ I

## ВЫТОКІ МІФАЛОГІІ. ЯЕ РАННІЯ ФОРМЫ

**Сацыяльна-псіхалагічныя передумовы ўзнікнення міфалагічнай свядомасці. Фарміраванне міфалагічных уяўленняў**. **Архаічны (даміфалагічны) светапогляд**. **Татэмізм** як адна з найбольш старажытных форм народных вераванняў (эпохі палеаліту). Навуковыя тэорыі татэмізму.

Выспяванне культу продкаў на аснове татэмізму. Значэнне татэмізму ў сацыяльнай арганізацыі першабытнага грамадства.

Рэшткі татэмізму ў сучаснай культуры.

**Анімізм** як тып светапогляду дагістарычнай эпохі. Паняційны ланцуг: адухаўленне прыроды – вера ў духоўныя сутнасці (духаў) – разуменне чалавечай душы. Суіснаванне анімізму і адной з сусветных рэлігій ў некаторых сучасных краінах Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. Анімістычны светапогляд як аснова метафарызацыі мовы, паэтычнага паралелізму ў фальклоры, у цэлым тропікі – як фальклору, так і літаратуры.

Духі прыроды ў славян (ніжэйшая міфалогія). **Магія і рытуал.** Магія як “супернавука” старажытнасці. Магія як сістэма псіхатэхнікі і рытуалаў. Віды магіі.

Магічныя функцыі мовы (вербальная магія). Замовы як адзін з найбольш ранніх міфалагічна-фальклорных жанраў і як канцэнтраванае ўвасабленне веры ў магію слоў. Цікавасць да замоў з боку беларускай авангарднай паэзіі. Час і прастора ў замове. Камунікацыйная стратэгія замовы. Іншыя формы вербальнай магіі: малітвы, мантры, формулы гіпнозу і аўтатрэнінгу. Сугестыўная функцыя мовы як уваход у падсвядомасць. Выкарыстанне вербальнай магіі ў сучасных СМІ і піяртэхналогіях (нейра-лінгвістычнае праграмаванне). Небяспека псі-зброі.

Функцыі рытуалу. Тыпы рытуалаў. Рытуальныя сімвалы. Старажытныя містэрыі. Рытуалы “пераходу” ў традыцыйнай культуры ўсходніх славян.

**Вытокі заходняга і ўсходняга менталітэтаў.** Асаблівасці культуры Захаду і Усходу. Фактары фарміравання беларускай нацыі.

# РАЗДЗЕЛ II

# КАСМАГОНІЯ І КАСМАЛОГІЯ

## 2.1 Міфалагічная мадэль свету

**Касмічная Яечка** як адзін з найбольш архаічных касмалагічных архетыпаў, характэрных для ўсіх народаў свету. Свяшчэнныя птушкі ў фальклоры, літаратуры, выяўленчым мастацтве. Сімволіка пяра.

**Касмічнае Кола** як мадэль Сусвету. Сімволіка **“цэнтра”**. Паўтор касмагоніі на Зямлі. Гара як цэнтр Свету, вобраз Свету. Сусветная Гара як адзін з глабальных архетыпаў.

**Касмічнае Дрэва (Прадрэва)** як мадэль Свету, вось Свету. Міфалагема Прадрэва ў касмаганічна-філасофскім сэнсе. Час і прастора ў сувязі з Дрэвам. Іканаграфія Сусветнага Дрэва. Вобраз Прадрэва – аснова для ўпарадкавання мыслення.

Раслінны эпас славянаў. Міфалагічныя расліны (папараць-кветка, разрыў-трава, мандрагора і інш.). Кветкі ў легендах і паданнях. Шэдэўры ландшафтнай архітэктуры ў свеце (паркі Англіі, Італіі, Францыі і інш.) і выкарыстанне ў ёй міфалагічных уяўленняў. Ландшафтны дызайн на Беларусі.

**Натурфіласофія і міфалогія**. Блізкасць да антычнай і сярэднявечнай натурфіласофіі міфалагічных уяўленняў еўрапейскіх народаў.

## 2.2 Міфы пра стварэнне свету

Міфы пра ўтварэнне Космасу і Зямлі ў розных міфалагічных сістэмах. Касмічны Шлюб – шлюб Зямлі і Неба. Увасабленне касмічнай энергіі ў пэўных міфалагічных вобразах (Змей). Касмічная Ахвяра.

Паняцце Хаосу. Галоўныя натурфіласофскія стыхіі: агонь, вада, зямля, паветра. Асноўныя натурфіласофскія стыхіі або элементы сусвету ў Бібліі. Натурфіласофскія стыхіі ў творах класікаў беларускай літаратуры, рускай літаратуры, славянскіх літаратур.

Міфы пра стварэнне Свету як ланцуг нараджэння багоў, якія мадэлірують асноўныя прыродныя з’явы і аб’екты. Розныя пакаленні багоў у антычнай міфалогіі.

Творчы акт Бога-Стваральніка (Дэміурга); Стварэнне Свету пры дапамозе Думкі-Слова (Логаса). Стварэнне Свету паводле Бібліі: сімвалічны і эзатэрычны сэнс.

Зорнае неба ва ўяўленнях старажытных людзей. Астральныя міфы ў культуры беларусаў. Сувязь курганна-мегалітычнай культуры з касмагоніяй.

## 2.3 Сонца і яго “сям’я”. Зямля ў Сонечнай сістэме

Культ Сонца ў сувязі з культам смерці ў Старажытным Егіпце і яго ўплыў на еўрапейскую культуру. Сонечны пантэон індаеўрапейцаў. Сонечныя багі Антычнасці. Абагаўленне Сонца ў славянаў. Багі Святла. Святло – цемра: міф пра змеяборства – перамога над смерцю, ліхам, цемрай.Месяцавыя міфы. Сучасныя міфы пра Поўню (Месяц) і дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу. Поўня (Месяц) у народных павер’ях, прымхах, прыкметах, загадках. Вобразы жывёл (птушак), што ўвасаблялі Сонца і Поўню. Вобразы Сонца і Месяца ў літаратуры.

**Беларускі нацыянальны монаміф у індаеўрапейскім кантэксце.**

# РАЗДЗЕЛ III

# КОСМАС – ГІСТОРЫЯ – НАРОД

## 3.1 Космас і гісторыя

Старажытныя **календары** народаў свету. Гадавы цыкл у індаеўрапейскіх народаў. Народны славянскі каляндар прыроды. Земляробчы каляндар усходніх славян. Міфалогія месяца, тыдня, дня, ночы.

**Час і прастора** ў міфалогіі. Міфалагічны час у яго суаднесенасці з часам гістарычным. **Вобраз-хранатоп** у літаратуры. Топас дарогі ў беларускай літаратуры.

**Каляндарныя міфы**.

## 3.2 Гісторыя. Народ

Агульныя вытокі міфалогіі еўрапейскіх народаў. Культ Прыроды ў старажытных індаеўрапейцаў. Вярхоўныя божышчы славян. Вялікая багіня Лада. Антаганізм Пярун – Вялес. Загадкавы Стрыбог.

Міфалагічныя сістэмы розных індаеўрапейскіх народаў. Антычная міфалогія (грэчаская і рымская). Ведыйская міфалогія. Міфалогія кельтаў. Германа-скандынаўская міфалогія. Міфы балтаў. Міфалогія паўднёвых і заходніх славян.

## 3.3 Міфічныя пакаленні

Міф пра стварэнне Чалавека. Першалюдзі **Адам і Ева**. Міф пра першародны грэх і яго розныя філасофскія тлумачэнні. Міфы пра стварэнне расаў і народаў.

Казачныя героі і іх паходжанне ад бостваў і духаў міфалогіі. Міфалагічныя персанажы чароўных казак (Баба-Яга, Кашчэй, Цмок) і розныя гіпотэзы іх генезісу. Міфалагізаваны герой у легендах і паданнях. Міфалагізаваны герой у сучаснай літаратуры. Міфалагізацыя рэальных людзей – палітыкаў, зорак кіно і шоў-бізнесу.

# РАЗДЗЕЛ IV
# ЧАЛАВЕК І КОЛА ЯГО ЖЫЦЦЯ. ЧАЛАВЕК І ЯГО ДОМ

## 4.1 Чалавечы лёс і душа

Уяўленні народаў свету пра лёс чалавека. Боствы, што ўвасаблялі чалавечы лёс у розных міфалагічных сістэмах. Доля і Нядоля. Паняцце кармы. Несмяротнасць чалавечай душы і тэорыі рэінкарнацыі. Філасофскае разуменне душы. Бог – душа – мараль у сусветных рэлігіях. Хрысціянскае разуменне асобы: адзінства душы-цела.

## 4.2 Сям'я – род – народ

Міфалагічныя погляды на жыццё. Культ продкаў і звязаныя з ім уяўленні пра іншасвет. Культ бога Рода.

## 4.3 Чалавек і яго лёс

Жыццёвы шлях чалавека. Розныя ўзросты чалавека. Перытальны перыяд у жыцці чалавека. Касмаганічны сэнс кахання ў міфах. Сакральнасць шлюбу. Міфалагічныя формы шлюбу. Вясельная абраднасць у сувязі з каляндарнай, земляробчай.

Міфалагізацыя хваробаў. Заканчэнне жыццёвага шляху. Рытуалы пахавання і памінання ў сувязі з міфалагічнымі ўяўленнямі пра жыццё-смерць, пра іншасвет.

## 4.4 Міфалогія Дома і гаспадарчай дзейнасці

Вытокі гасціннасці. Этнічныя сімвалы гасціннасці (кшталту “хлеб-соль”) і іх генезіс.

“Будаўнічая ахвяра”. Сакральнасць месца і часу будаўніцтва. Міфы, звязаныя з будаўніцтвам пэўных аб'ектаў (гарадоў, храмаў). Храм як Дом Бога. Міфы і абраднасць, звязаныя з новым жытлом.

Духі жытла і сядзібы: Дамавік, Гуменнік, Хлеўнік, Лазнік, Кікімара. Палтэргейст і яго навуковыя тлумачэнні.

Земляробчая магія. Абрады, звязаныя з полем і зборам ураджаю. Боствы ўрадлівасці. Культ Маці-Зямлі і Багародзіцы ў беларусаў.

# РАЗДЗЕЛ V
# МІФАЛОГІЯ І ЛІТАРАТУРА

**Філасофскі аспект** суадносін міфа і мастацкай літаратуры. Філасофскія праблемы ў мастацкай літаратуры свету.

**Культуралагічны аспект** суадносін міфа і мастацкай літаратуры. Анімістычны светапогляд як аснова метафарызацыі. Архетыпы як грунт для ўтварэння мастацкай сімволікі. Магія імені. Анамастыка і мастацкая літаратура. Міф і рытуал, іх адлюстраванне ў мастацкай літаратуры.

**Эвалюцыйны аспект** суадносін міфа і літаратуры. Антычныя міфы і антычная літаратура. Рэцэпцыя Антычнасці ў беларускай, рускай і замежнай літаратуры XX-XXI стагоддзяў. Літаратура Старажытнага Усходу. Гераічныя міфы. Міф у літаратуры Барока і Новага часу. Міф у літаратуры рамантызму.

**Тыпалагічны аспект** суадносін міфа і мастацкай літаратуры. Час і прастора ў міфе і мастацкай літаратуры. Прычынна-выніковыя сувязі ў міфе і прыгожым пісьменстве.

**Нацыянальная своеасаблівасць беларускай літаратуры**. Міф і нацыянальная ідэя. Нацыянальныя архетыпы. Асноўныя матывы і вобразы беларускай літаратуры.

**Новыя падыходы да вывучэння мовы (этымалогіі) і фальклору (**метад міфалагічнай рэстаўрацыі і інш.).

**Міфапаэтычны аналіз мастацкага тэксту**. Методыка аналізу.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праблема "Вялесавай кнігі". Язычніцкі пантэон князя Уладзіміра. Лёс міфалогіі пасля хрысціянізацыі. Народнае праваслаўе. Беларус-дваявернік.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Андреев Д.** Роза Мира. М., 1991.
2. **Асов А**. Мифы и легенды древних славян. М.. 1998.
3. **Афанасьев А**. Поэтические воззрения славян на природу. В 3 т. М., 1995.
4. **Баландин А.И**. Мифологическая школа в русской фольклористике. М., 1988.
5. **Барт Р**. Мифологии. М., 1996.
6. **Бассин Ф.В**. Проблема бессознательного. М., 1968.
7. **Бахтин М.М**. Литературно-критические статьи. М., 1986.
8. **Башляр Г**. Психоанализ огня. М., 1993.

10\. Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. Мн., 1988

11\. **Бельскі А**. Свет ад травы да зор. Беларуская паэзія: Сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу. Мн., 1998.

9\. **Белякова Г.С**. Славянская мифология. М., 1995.

10\. Библия. М., 1988.

11\. **Богданович А**. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Мн., 1996.

12\. **Булашев Г**. Украінский народ у сваіх легендах, рэлігійных поглядах та віруваннях. Кіів, 1993.

13. **Вейман Р**. История литературы и мифология. М., 1975.
14. **Велецкая Н.Н**. Языческая символика славянских архаических ритуалов. М., 1978.
15. **Власова М**. Русские суеверия. Энциклопедический словарь. СПб., 1998.
16. **Гачев Г**. Национальные образы мира. М., 1988.
17. **Голан А**. Миф и символ. М., 1993.
18. **Голосовкер Я.Э**. Логика мифа. М., 1987.
19. **Грейвс Р**. Мифы Древней Греции. М., 1992.
20. **Грейвс Р**. Белая Богиня: Историческая грамматика поэтической мифологии. М., 1999.
21. **Гримм Я.** Немецкая мифология // Зарубежная эстетика и теория литературы XIX-XX веков: Трактаты, статьи, эссе. М., 1987.
22. **Гринев В**. Праязык и символ. Киев, 1999.
23. **Дюмезиль Ж**. Верховные боги индоевропейцев. М., 1986.
24. **Еремина В.И**. Ритуал и фольклор. Л., 1991.
25. **Зайкоўскі Э**. Багі старажытнай Беларусі // Роднае слова, 1996. № 12.
26. Земляробчы каляндар. Мн., 1990.
27. **Іванов В., Топоров В**. Славянские языковые моделирующие системы. М., 1965.
28. Историческая поэтика: Литературные эпохи и типы художественного сознания. М., 1994.
29. **Каваленка В.А**. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. Мн., 1981.
30. **Кайсаров А**. Славянская и российская мифология // Мифы древних славян. Саратов, 1993.
31. **Кассирер Э**. Опыт о человеке. М., 1990.
32. **Кассу Ж**. Энциклопедия символов. М., 1998.
33. **Керлот Х.Э**. Словарь символов. М., 1994.
34. **Кольев А**. Миф масс и магия вождей. М., 1999.
35. **Конан У**. Ля вытокаў самасвядомасці. Мн., 1989.
36. **Ковель У**. Народныя ўяўленні, павер’і і прыкметы: даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі. Гомель, 1995.
37. **Кононенко А.А**. Персонажи славянской мифологии. Киев, 1999.
38. **Крапп А.** Астрономия. Легенды и предания. М., 1999.
39. **Красиков С**. Цветы в преданиях. Мн., 1989.
40. **Купер Д**. Энциклопедия символов. М., 1995.
41. **Кэмпбелл Д**. Тысячеликий герой. М., 1997.
42. **Ліцьвінка В**. Святы і абрады беларусаў. Мн., 1998.
43. **Лозка А**. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993.
44. **Лосев А.Ф.** Очерки античного символизма и мифологии. М., 199
45. **Лотман Ю.М., Минц З.Г**. Литература и мифология Труды по знаковым системам (Уч.записки Тартусского гос.ун-та). Т.13. Вып.546. Семиотика культуры. Тарту, 1981.
46. **Лотман Ю.М**. Внутри мыслящих миров. М., 1999.

47. **Маковский М.М.** Сравнительный словарь мифологической символики в индоевропейских языках. М., 1996.
48. **Малиновский Б**. Магия, наука и религия // Мистика. Религия. Наука: Классики мирового религиоведения. М., 1998.
49. **Мамуна Н.В.** Зодиак мистерий. М., 1998.
50. **Маслова В.А**. Преданья старины глубокой в зеркале языка. Мн., 1997.
51. **Мелетинский Е.В**. Введение в историческую поэтику эпоса и романа. М., 1986.
52. **Мелетинский Е.В**. Поэтика мифа. М., 1995.
53. **Меликов В.В**. Введение в текстологию традиционных культур. М., 1999.
54. **Мечковская Н.Б**. Язык и религия. М., 1998.
55. Міфы Бацькаўшчыны // Укл.Ул. Васілевіч. Мн., 1994.
56. Мифы народов мира. Энциклопедия. В 2 т. М., 1982.
57. Мифы и магия индоевропейцев. Вып.1-9. М., 1994-2000.
58. **Ненадавец А.Н**. За смугою міфа. Мн., 1999.
59. **Николаева Н.А., Сафронов В.А**. Истоки славянской и евразийской мифологии. М., 1999.
60. **Нойманн Э**. Происхождение и развитие сознания. М., 1998.
61. **Петухов Ю.Д**. Дорогами богов: Этногенез и мифогенез индоевропейцев. М., 1998.
62. **Потебня А.А**. Эстетика и поэтика. М., 1976.
63. **Пропп В.Я**. Исторические корни волшебной сказки. Л., 1986.
64. **Пропп В.Я**. Поэтика фольклора. М., 1998.
65. **Рублеўская Л**. Партрэт нацыі. Аспекты нацыянальнага міфа ў беларускай паэзіі 10-20-х гг.XX ст. /  Роднае слова, 1995. № 8, № 10.
66. Русские веды. М., 1992.
67. Русский космизм. Антология философской мысли. М., 1993.
68. **Рыбаков Б.А**. Язычество древних славян. М., 1981.
69. **Рыбаков Б.А**. Язычество древней Руси. М., 1987.
70. **Семенова М**. Мы – славяне. Популярная энциклопедия. СПб., 1997.
71. **Сержпутоўскі А.К.** Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн., 1998.
72. Славянская мифология. Энциклопедический словарь. М., 1995.
73. Славянские древности. Этнолингвистический словарь. В 5 т. Т.1-2. М., 1995-1999.
74. **Соболев А.Н**. Мифология славян. Загробный мир по древнерусским представлениям. СПб., 1999.
75. **Соколова В.К**. Весенне-летние обряды русских, украинцев и белорусов. М., 1979.
76. **Соколова З.П.** Животные в религиях. СПб., 1998.
77. **Супрун А.Е.** Введение в славянскую филологию. Мн., 1989.
78. **Сысоў У.М.** З крыніц спрадвечных. Мн., 1997.
79. **Тайлор Э.Б.** Первобытная культура. М., 1989.
80. **Тарнас Р.** История западного мышления. М., 1995.

81. **Тахо-Годи А.А.** Греческая мифология. М., 1989.
82. **Телегин С.М.** Философия мифа: Введение в метод мифореставрации. М., 1994.
100. **Токарчик А.** Мифы о бессмертии. М., 1992.
101. **Торчинов Е.А.** Религии мира. СПб., 1998.
102. **Трессидер Д.** Словарь символов. М., 1999.
103. **Фаминцын А.С.** Божества древних славян. Спб., 1998.
104. **Фрезер Д.Д.** Золотая ветвь. М., 1983.
105. **Фромм Э.** Душа человека. М.. 1992.
106. Христианство. Энциклопедический словарь. В 3 т. М., 1993-1996.
107. **Чарота І.А.** Пошук спрадвечнай існасці. Беларуская літаратура XX ст. у працэсе нацыянальнага самавызначэння. Мн., 1995.
108. **Черепанова И.** Дом колдуньи: язык творческого бессознательного. М., 1996.
109. **Шилов Ю.** Пути ариев. Киев, 1996.
110. **Шеллинг В.Ф.** Философия искусства. М., 1966.
111. **Шуклин В.** Мифы русского народа. Екатеринбург, 1995.
112. **Элиаде М.** Космос и история. М., 1987.
113. **Элиаде М.** Мифы, сновидения, мистерии. М., 1996.
115. Энциклопедия мистицизма. СПб., 1997.
119. **Юдин А.В.** Русская народная духовная культура. М., 1999.
120. **Юнг К.Г.** Душа и миф. Шесть архетипов. Киев, 1996.
121. **Юнг К.Г.** Алхимия снов. СПб., 1997.
122. **Юнг К.Г.** Символы Матери и Возрождения // Между Эдипом и Осирисом. Львов-Москва, 1998.
123. **Якушин Б.В.** Гипотезы о происхождении языка. М., 1985.